# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*
## 9 клас
## Варыянт 2

### Заданне 1.

| *Складанае слова* | *Кампаненты вытворнага слова* | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | *1* | *2* | *3* | *4* |
| *пусталісты* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **нулявы суфікс** |
| | кампанент | ***пуст-(ы)*** | ***-а-*** | ***ліст-(ø)*** | **ø** |
| *сухавей* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **нулявы суфікс** |
| | кампанент | ***сух-(і)*** | ***-а-*** | ***вej/а-(ць)*** | **ø** |
| *зорнацветны* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **суфікс** |
| | кампанент | ***зорн-(ы)*** | ***-а-*** | ***цвет-(ø)*** | ***-н-*** |
| *цемратворац* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **суфікс** |
| | кампанент | ***цемр-(а)*** | ***-а-*** | ***твар/ы-(ць)*** | ***-ац*** |
| *станогі* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **нулявы суфікс** |
| | кампанент | ***ст-(о)*** | ***-а-*** | ***наг-(а)*** | **ø** |
| *светаўладны* | статус | **аснова** | **злуч. галосны** | **аснова** | **суфікс** |
| | кампанент | ***свет-(ø)*** | ***-а-*** | ***улад/а-(ць)*** | ***-н-*** |

*За правільна вызначаны статус усіх кампанентаў у кожным слове – 0,5 бала, за правільна вызначаныя ўсе кампаненты ў кожным слове – 0,5 бала.*

### Заданне 2.

| ***Фраг-мент*** | ***Колькасць мяккіх зычных*** | | | |
|---|---|---|---|---|
| | ***2*** | ***3*** | ***4*** | ***5*** |
| **1** | ***шапацяць***<br>***залацістыя***<br>***веткі***<br>***пусталістыя*** | ***глядзяць*** | ***шалясцяць*** | |
| **2** | ***гняце***<br>***болей***<br>***спавівае***<br>***сухавей***<br>***гуляе***<br>***зернем***<br>***сіратой*** | | | |
| **3** | ***кайданнае***<br>***з'яву***<br>***нечаканую***<br>***сягоння***<br>***людзям*** | ***песню***<br>***сляпіла***<br>***яснасць***<br>***зорнацветную***<br>***развеяла*** | ***беспрасветную*** | |

*За бездакорнае выкананне ў межах аднаго фрагмента налічваюцца 2 балы. За кожную памылку рэкамендуецца здымаць па 0,5 бала ў межах фрагмента, але павінна атрымацца не менш за нуль балаў.*

**Заданне 3.**

1. Міхаіл для Леаніда Рыгоравіча і Аксаны Віктараўны – **зяць**.
2. Вераніка для Аляксея Аляксеевіча і Наталлі Пятроўны – **нявестка**.
3. Маша для Наталлі Пятроўны – унучка.
4. Юрый для Ромы – **дзядзька**.
5. Наталля Пятроўна для Машы – **бабуля**.
6. Рома для Юрыя і Веранікі – **пляменнік**.

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| ***Памылка*** | ***Выпраўлены варыянт*** | ***Тлумачэнне*** |
|---|---|---|
| Тры судна | Тры судны | Памылка звязана з дапасаваннем лічэбніка да назоўніка: пры лічэбніках *два, тры, чатыры* і састаўных колькасных, якія заканчваюцца на *два, тры, чатыры*, назоўнікі павінны мець форму назоўнага склону множнага ліку. |
| Больш дзесяці метраў | Больш за дзесяць метраў (больш, чым дзесяць метраў; больш, як дзесяць метраў) | Памылка ў кіраванні: пры простай форме вышэйшай ступені параўнання прыметнікаў і прыслоўяў лічэбнікі (назоўнікі займеннікі) павінны мець форму вінавальнага склону з прыназоўнікам *за* (назоўнага склону са злучнікамі *чым, як*). |
| Майстар Руба кіраваў на верфі, які здабыў найбольшы вопыт у карабельных справах. | На верфі кіраваў майстар Руба, які здабыў найбольшы вопыт у карабельных справах. | Даданая азначальная частка павінна стаяць пасля слова, да якога яна адносіцца. |
| Усяслаў і яго гандляры з Полаччыны не толькі заўжды прывозілі на радзіму каштоўнасці і ўсялякае дабро, але і новыя ўражанні. | Усяслаў і яго гандляры з Полаччыны заўжды прывозілі на радзіму не толькі каштоўнасці і ўсялякае дабро, але і новыя ўражанні. | Састаўны злучнік *не толькі..., але і...* звязвае аднародныя члены сказа. Гэта значыць, што першая частка злучніка павінна стаяць непасрэдна перад першым аднародным членам, другая, адпаведна, перад другім. У прыведзеным прыкладзе першая частка злучніка *не толькі...* аддалена ад аднароднага члена сказа іншымі членамі сказа. |
| …набытым досведам у іншых народаў | …набытым у іншых народаў досведам | Дзеепрыметнікавы зварот разрываць нельга. |
| Тых, хто спрабавалі пярэчыць волі князя, чакала… | Тых, хто спрабаваў пярэчыць волі князя, чакала… | Займеннік *хто* не змяняецца па ліках, выказнік заўсёды каардынуецца з ім толькі ў адзіночным ліку. |

*За кожную дакладна вызначаную памылку і правільнае яе выпраўленне – па 0,25 бала, за правільнае тлумачэнне – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| *Дзеяслоў* | *Спра-жэнне* | *Інфінітыў* | *Дзеяслоў у форме 2-й асобы множнага ліку цяперашняга або будучага простага часу (з абавязковай пастаноўкай націску)* | *Дзеепрыслоўе* |
|---|---|---|---|---|
| ***Заклаў*** | I | Закласці | Закладзяцé | Заклаўшы |
| ***Вярталіся*** | I | Вяртацца | Вяртáецеся | Вяртаючыся |
| ***Узводзіліся*** | II | Узводзіцца | Узвóдзіцеся | Узводзячыся |

*За кожную правільна запоўненую ячэйку – 0,5 бала.*

**Заданне 6.**

| **№** | **Прымета** | **Правільна** |
|---|---|---|
| **1** | Узнаўленне, стварэнне чаго-н. эксперыментальным шляхам. | + |
| **2** | У форме роднага склону мае канчатак -*У*. | + |
| **3** | Уваходзіць у сінанімічны рад *практыка, кампетэнцыя, эксперымент, навык*. | + |
| **4** | Значэнне фразеалагізма ***сабаку з'еў*** – страціў *вопыт*, майстэрства. | |
| **5** | У пачатковай форме слова мае прыстаўку, корань і нулявы канчатак. | |
| **6** | У форме меснага склону мае канчатак -*Е*. | + |

*За кожны дакладны адказ (вызначэнне правільнасці /няправільнасці) – 1 бал.*

**Заданне 7.**

ПРЫКЛАДНЫ ВАРЫЯНТ ПЕРАКЛАДУ:

Раней Ваня амаль не звяртаў увагі на варонкі, якія трапляліся яму на шляху. Яны яго не датычыліся *(датычылі, тычыліся)*, ён ведаў, што «гэта» ўжо адбылося, што небяспека мінула. Цяпер жа ён раптам убачыў іх зусім па-іншаму. Нямецкія снарады толькі што прыляталі і разарваліся вакол гарматы, пакінуўшы злавесныя сляды. Але ж батарэя не сышла. Гармата стаяла на ранейшым *(тым самым)* месцы. Значыць, нямецкія снарады ў любы момант маглі прыляцець зноў *(ізноў)* і на гэты раз прынесці смерць. Здавалася, само паветра дыхае вакол смерцю. Цень смерці ляжаў на хмарах, на ялінках *(елачках)*, на зямлі.

*За кожную лексічную або граматычную памылку рэкамендуецца здымаць 0,5 бала, за арфаграфічную або пунктуацыйную – 0,25 бала.*

**Заданне 8.**

| | |
|---|---|
| **А** | **завязка** |
| **Б** | **ямб** |
| **В** | **анафара** |
| **Г** | **трыялет** |
| **Д** | **драма / драматургія** |
| **Е** | **рыфма / рыфмоўка (перакрыжаваная)** |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 9.**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | [2]к | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | р | | [3]б | а | н | д | а | р | о | ў | н | а |
| | | | | | | ы | | е | | | | | | | | | |
| | | | | | | н | | л | | | | | | | | | |
| | [1]к | л | ё | ц | к | і | | а | | | | | | [9]а | | | |
| | | | | | | ц | | р | | [7]м | а | ш | э | к | а | | |
| | | | | | | к | | у | | і | | | | і | | | |
| | | | | | | а | | с | | ц | | | | н | | | |
| | | | | | [4]в | я | з | ы | н | к | а | | | ч | | | |
| | | | | | | | | | | е | | | | ы | | | |
| | | | | | | [8]л | у | ц | э | в | і | ч | | ц | | | |
| | | [6]х | | | | і | | | | і | | | | ы | | | |
| | | м | | | | с | | | | ч | | | | | | | |
| [5]а | н | а | п | е | с | т | | | | | | | | | | | |
| | | р | | | | а | | | | | | | | | | | |
| | | к | | | | п | | | | | | | | | | | |
| | | а | | | | а | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | д | | | | | | | | | | | |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

*Выкананне задання ацэньваецца па частках А, Б, В. Максімальны бал за кожную частку – 2. Максімальная колькасць балаў за выкананне задання – 6.*

*Частка А.*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| *2* | *Дадзена лагічнае і абгрунтаванае тлумачэнне. Указана, што твор Алеся Бачылы “Радзіма мая дарагая…” не з’яўляецца эпічным.* |
| *1* | *Дадзена лагічнае і абгрунтаванае тлумачэнне.* |
| *0* | *Тлумачэнне нелагічнае, неабгрунтаванае.*<br>*АБО*<br>*Абгрунтаванне адсутнічае.* |

*Частка Б*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| *2* | *Прапанавана назва, якая істотна адрозніваецца ад выбранага тэматычнага прынцыпу, і дадзена лагічнае абгрунтаванне назвы. Напрыклад, выбраны прынцып часу напісання (“Беларускія залацінкі XX стагоддзя”).* |
| *1* | *Прапанавана назва, якая адрозніваецца ад выбранага тэматычнага прынцыпу, але дадзена нелагічнае абгрунтаванне ці яно адсутнічае.* |
| *0* | *Прапанавана назва паводле толькі тэматычнага прынцыпу.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае.* |

*Частка В*

| *Колькасць балаў* | *Крытэрый* |
|---|---|
| *2* | *Прапанаваны два прыклады, якія поўнасцю адпавядаюць выбранаму прынцыпу і ўмове задання.* |
| *1* | *Сярод прыведзеных прыкладаў ёсць тыя, якія поўнасцю адпавядаюць выбранаму прынцыпу і ўмове задання, і тыя, якія адпавядаюць не ў поўнай меры або цалкам не адпавядаюць.* |
| *0* | *Прапанаваны прыклады, якія не адпавядаюць выбранаму прынцыпу і/або ўмове задання.*<br>*АБО*<br>*Адказ адсутнічае.* |